Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana gyčałtam

№ 36 Вільня, Нядзеля 15 Лістапада 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Пажар на Далёкім Усходзе разгараецца.

Акупацыя Манджуры, якую Японія пачала праводзіць болей месяца таму назад, пашыраецца. Гэты вялізарны край, маючы ў сабе багатыя капальні вугля і жалеза, займаецца японскім войскам сыстэматычна, плянова і, як з усяго відаць, настала. Кітай, да каторага належыць Манджурыя, спачатку пратэставаў і заклікаў Лігу Народаў да інтэрвэнцыі. Праўда, Ліга Народаў загадала Японіі вывясьці свае войска з Манджуры, а Кітаю — ня крыўдзіць Японцаў, якія жывуць на кітайскай тэрыторыі і не байкатаваць японскіх тавараў, але Японія ня толькі ня споўніла гэтага загаду Лігі Народаў, але яшчэ і прыгразіла, што выступіць з Лігі і — далей займае Манджурыю.

Але займаючы далей Манджурыю, Японія закранула інтарэсы не аднаго толькі Кітаю, яна закранула інтарэсы іншых дзяржаў: Англіі, Францыі, Злуч. Штатаў П. Амэрыкі, а перадусім Саветаў. Як паступяць адносна японскай акупацыі гэтыя дзяржавы: ці будуць спакойна прыглядацца, як Японія забірае Манджурыю, ці ўмяшаюцца чынна ў гэту справу — гэтае пытаньне сяньня трывожыць увесь сьвет. Бо каліб, хоць адна з гэтых дзяржаў умяшалася ў вайну з Японіяй, гэта магло-б быць пачаткам новага вялікага пажару, які меў-бы сусьветнае значэньне. Аб гэтым пытаньні і мы сяньня пагаворым.

Што датыча Францыі, Англіі і Злуч. Штатаў П. Амэрыкі, то зьяўляецца бадай пэўным, што яны ў вайну з Японіяй мяшацца ня будуць, нават калі-б Японія заняла ўсю Манджурыю. Афіцыяльны орган францускага генэральнага штабу „France Militaire“ піша, што „ўсходня-кітайская чыгунка была праведзена за францускія капіталы, пазычаныя Расеі і францускі ўрад мае права дамагацца ўдзелу ў гэтай чыгунцы на выпадак пераходу яе пад міжнародны кантроль на месца сяньняшняга саўладаньня савецка-кітайскага“. Гэтыя словы франц. вайсковага органу сьведчаць, што Францыя яшчэ рада будзе з пераходу ўсходня-кітайскай чыгункі пад іншую апеку. Магчыма, што Японія ўжо на гэту тэму дагаварылася з заінтэрэсаванымі дзяржавамі.

У абароне Манджуры ня выступіць такжа Англія, для якой вельмі карысны быў-бы канфлікт Японіі з Саветамі. Гэты канфлікт прышчаміў-бы Саветы да „Манджурскіх сопак“ і гэтым спыніў-бы камуністычную агітацыю ў англ. калёніях. Тое самае датыча і Зл. Шт. П. Амэрыкі, гэтага найбольшага ворага Японіі на водах Ціхага акіяну, для якога карысна будзе, калі Японія ўмешаецца ў спрэчкі з Кітаем і Саветамі і скіруецца ў глыб Азіі, замест на Філіпіны і іншыя выспы Злуч. Штатаў і будзе ламаць свае вострыя зубы на Кітаю і Саветах. Урэшце, каб аканчальна высьвяцьціць амэрыканскім прамысловым і вайсковым кругом манджурскую справу, выехаў у Амэрыку прадстаўнік вялікага японскага капіталу граф Кабаяма. Значыць і Амэрыка ў Манджурскі канфлікт магчыма што ня ўмяшаецца, дык астаюцца Саветы, а трэба сказаць, што з Саветамі ўжо іншая справа.

Саветы дагэтуль чакалі рэзультату інтэрвэнцыі Лігі Народаў, але калі паглядзелі, што гэта інтэрвэнцыя памагае, як кашаль у хваробе, японскі кот пад акампаніямэнт Лігавых напамінаньняў ужо канчае есьці манджурскае курчаё, пачалі чынна выступаць у абароне сваіх інтарэсаў. А гэтыя інтарэсы не малыя! Адна ўсходня-кітайская чыгунка, што злучае Сібір з Уладывастокам чаго варта! Вось-жа Саветы пачалі выступаць чынна, але скрыта: пачалі канцэнтраваць свае войска на граніцы Манджуры, пачалі ўзбройваць кітайскіх генэралаў, пачалі разам з гэтым „камунізаваць“ паўночны Кітай. Аднак японская разьведка, якая стаяла заўсёды высока, даведалася аб тым і прадстаўнік японскага ўраду ў Маскве Хірота падаў савецкаму ўраду ноту ў справе помачы, якую аказаў савецкі ўрад кітайскаму генэралу Ма, што бараніў гораду Цыцыкару. Савецкі ўрад адказаў, што ён і знаць нічога ня знае і ведаць ня ведае і ніякай помачы кітайскім генэралам не даваў.

Ясна, што гэтаму адказу ў палітычным сьвеце не паверылі і пасьля гэтага факту ўсе дзяржавы зьвярнулі свае вочы на Манджурыю, дзе можа разыграцца новая японска-расейская вайна. Бо японскія войскі пасьля заняцьця паўднёвай Манджуры ўжо прыбліжаюцца да паўночнай і скора могуць дайсьці да Харбіну і ўсходня-кітайскай чыгункі, якая знаходзіцца такжа пад уладай Саветаў.

Саветы ня хочуць вайны з дзьвух прычын: раз—што яны слабейшыя за Японію, а другое — што замест будаваць фабрыкі і машыны і праводзіць пяцігодку, як кажа маскоўская „Праўда,“ мусілі-б жалеза і сталь і людзей вязьці аж у Манджурыю. У савецкім пляне ляжыць не змаганьне з Японіяй беспасрэдна сваімі сіламі, але каб скамунізаваць вялізарны Кітай і каб гэтыя 400 мільёнаў кітайцаў кінуць на Японію. Саветы гэты плян праводзяць і будуць праводзіць, толькі пытаньне, ці ім гэта ўдасца? Ці Японія будзе чакаць пакуль Саветы правядуць гэты плян? Палітыкі думаюць, што Японія сама ўдэрыць па Саветах, ня чакаючы, пакуль яны скамунізуюць Кітай. А тады, хто ведае, на чым скончыцца гэты манджурскі пажар!

Некаторыя польскія газэты ўжо пішуць, што таксама як блізу 30 гадоў таму на „Сопках Манджуры“ пачаўся канец расейскага царызму, так цяпер наступіць канец расейскага бальшавізму. А француская газэта „Liberte“ піша, што „калі Эўропа зразумее свой абавязак прад цывілізацыяй, то незадоўга сібірскія стэпы могуць стацца полем бітвы, на каторым згіне бальшавізм.“

У гэткім кірунку разгараецца пажар на Далёкім Усходзе. Дык Рада Лігі Народаў, якая зьяжджаецца на 16 гэтага месяца, каб тушыць манджурскі пажар, мусіць, разьедзецца, нічога не зрабіўшы. Здаецца, што ўжо ўсё ў справе Манджуры зроблена за плячамі Лігі Народаў.

Дык ей нічога не астаецца, як спакойна зысьці з гэтага сьвету. Манджурскі канфлікт паказаў усю нерэальнасьць такіх арганізацыяў, як сучасная Ліга Народаў.

Польска-жыдоўскія студэнскія забурэньні.

У мінулым тыдні ў Кракаве пачаліся польска-жыдоўскія студэнскія забурэньні. Польская шовіністычная студэнская моладзь пачала дамагацца аграніччэньня для жыдоў у ўнівэрсытэтах. Гэткія выступленьні пасьля Кракава пачаліся ў Варшаве і вельмі сумным рэхам адбіліся ў Вільні.

У Вільні праз два дні — 9 і 10 г. м. адбываліся між польскай і жыдоўскай моладзяй фармальныя бойкі. У выніку гэтай бойкі ёсьць забітыя і многа раненых.

Дня 10 г. м. у часе дэманстрацыяў польскага студэнства на вуліцах Вільні, хуліганы дэмалявалі магазыны — разьбівалі ў магазынах вокны і дзьверы.

Напад на Беларускую друкарню ім. Фр. Скарыны.

У часе вулічных дэманстрацыяў польскага студэнства, у аўторак 10 г. м., дэманстранты пускаючы каменьмі і цэгламі ў Беларускую Друкарню ім. Фр. Скарыны ў Вільні на Завальнай вул. № 6 павыбівалі ў друкарні вокны і акяніцы.

Два „выступленьні“ ў Беларускім Студэнскім Саюзе.

У апошнія гады свайго існаваньня Беларускі Студэнскі Саюз (Б.С.С.) у Вільні перажыў два характэрныя факты, два здарэньні, якія кідаюць яркае сьвятло на ідэолёгічны бок і арганізацыйную дысцыпліну некаторых яго сяброў.

Першым здарэньнем, якое адбылося ў другой палове акадэміцкага 1928-29 году ў сувязі з салідарным выступленьнем трох студэнскіх саюзаў: Беларускага, Украінскага і Літоўскага на сходзе Братняе Помачы У.С.Б. — гэта выступленьне часткі сяброў Б. С. С., т. зв. паступоўцаў. Гэтая частка сяброў Б.С.С. насупроць салідарнасьці, зрабіла ў імя „сваіх палітычных інтарэсаў“ на ўспомненым сходзе Братняе Помачы свае „выступленьне“. Тагачасны Урад Б.С.С., у якога склад уваходзілі сябры розных пераконаньняў, ратуючы павагу і добрае імя свае арганізацыі, пакараў найбольш віноўных гэнага выступленьня, — спыненьнем іх у сяброўскіх правох аж да вырашэньня іх справы агульным Сходам Б.С.С. Незадоўга пасьля гэтага адбыўшыйся сход сяброў Б.С.С. апрабаваў паступак Ураду у адносінах да вінаватых сяброў і з свайго боку іх адпаведна пакараў. Усе тады салідарызуючыяся з пакаранымі сябры Саюзу пакінулі яго ў імя пратэсту проціў прыгавору сходу, утварылі асобную групу студэнтаў, паступоўцаў, пачалі выдаваць свой орган п. н. „Вольную Думку“ і адным словам пачалі паказываць свае „wyczyny twórcze“.

Няма сумліву ў таго, хто ор'ентуецца хоць крыху ў беларускім грамадзкім жыцьці агулам, а ў жыцьці студэнскім у асобнасьці, што ўся акцыя гэтых студэнтаў была з пункту гледжаньня агульна-людзкага ў пэўнай меры, можна сказаць, сымпатычнай, а гэта дзеля таго, што віноўнікі гэнага выступленьня ў сваім паступаньні кіраваліся матывамі ідэовымі, згодна з сваёю тактыкай і ў добрай веры, а так-жа і дзеля таго, што гэныя студэнты — гэта людзі, якія маюць свае перакананьні, у імя якіх працавалі, а некаторыя з іх нават і цярпелі.

Пачатак другога здарэньня, зарысаваўся вясной сёлетняга году — на адбыўшымся ў траўні месяцы агульным гадавым сходзе сяброў Б. С. С.

Справа ў тым, што ўступаючы „стары“, з мінулага акадэміцкага году, Урад Б.С.С., на чале з К. Глінскім, за часоў свайго „урадаваньня“ дапусьціўся шмат карыгодных пахібаў і паступкаў, як тактычнага, так і фармальнага характару, ня кажучы ўжо аб матэр'яльнай старане гэных пахібаў і паступкаў. Але міма ўсяго гэтага, агульны сход, прыняўшы пад увагу, што ўсе папярэднія

ўрады Б.С.С. атрымлівалі абсолюторыі, адносва Ураду К. Глінскага наступаў лагодна, агранічываючыся да выражэньня яму (Ураду) абсалюторыі з засьцярогай выгавару (наганы).

Такое лагоднае вырашэньне справы так асьмеліла Ўрад Глінскага, што некаторыя сябры яго са сваімі староньнікамі *per fas et nefas* стараліся пралезьці ізноў у склад органаў Саюзу (асабліва ў склад Рэв. Камісіі)— на наступны (сёлетні) акадэміцкі год — мусіць дзеля таго, каб ізноў у Саюзе гаспадарыць па-свойму... аполітычна, але політычна, а таксама мо' дзеля таго, каб „схаваць" іх скандалічныя „дзеі", — „дзеі-чыны" нават крымінальнага характару (справа доўгу магістрату!), з якіх некаторыя пазьней паказаліся на сьвятло дзеннае!!!...

Але тут — стоп! Сход ня выбраў ані воднага з сяброў старога Ураду, ані з іх староньнікаў у органы Саюзу. І ў гэтым мамэнце родзіцца другое выступленьне. Стары Ўрад і яго прыхільнікі, чапляючыся безпадстаўна да прабегу нарадаў сходу ў сэнсе фармальным, складаюць заяву прэзыдыюму сходу аб тым, што яны не прызнаюць(!) новавыбраных органаў Б.С.С., а самі пакідаюць сход. Мала гэтага — яны ў наступныя пасьля сходу дні ідуць да прафэсара Владычкі, апякуна Б.С.С., і складаюць яму мэмор'ял, у якім аднастаронна прадстаўляюць вытвараную сытуацыю і свае пажаданьні, а ў міжчасе стары Урад не здае функцыяў Ураду Саюзу нававыбранаму. Праф. Владычка, зор'ентаваўшыся відаць добра ў сытуацыі, не згадзіўся з імі, бо заапрабаваў новавыбраныя органы Саюзу (Урад і Рэв. Камісію), а папярэдняму Ўраду загадаў здаць функцыі Ураду новаму. Ясна, што непамысны вынік захадаў гэных студэнтаў — у праф. Владычкі — ёсьць іх чарговай кампрамітацыяй. Але гэтым ня кончыцца іх акцыя. Яны закладаюць „сваю" арганізацыю — корпорацыю „Scorinia".

Аўтар гэтага артыкулу прынцыпова ня мае нічога проціў адносна паўставаньня арнізацыяў у форме корпорацыяў. Такія арганізацыі сярод студэнтаў паўставалі і паўстаюць. Такія арганізацыі маюць рацыю быту, але тады, калі паўстаюць з матываў чыстых і маюць прыгожыя ўзгадаваўчыя мэты; і тады яны дасягаюць гэныя мэты, калі перадусім кіраўніцтва корпорацыяў знаходзіцца ў руках людзей ідэовых і крыштальных характараў.

А што можна сказаць аб галоўных корпорантах „Scorinia"? Аўтар стацьці „Дзьве Душы", надрукаванай у нумары 34 „Бел. Крыніцы", падаў больш-менш матывы, якімі кіраваліся закладчыкі „Scorinia", падкрэсьліваючы асабліва матыў матэр'яльны. Але трэба яшчэ сёе-тое дадаць.

Знаючы добра некаторых закладчыкаў корпорацыі „Scorinia", якія будучы сябрамі Б. С. С, адзначаліся перадусім тым, што муцілі студэнскую кадзь, займаліся рознага характару інтрыгамі і афэрамі, адзначаліся, як дзейнікі дэмаралізуючыя студэнскую сям'ю, — а якія сяньня адыгрываюць ролю „узгадаваўцаў" у „Scorinii" — сказаць з пэўнасьцю можна, што „Scorinia" паўстала дзеля заспакаеньня кар'еровічоўскіх амбіцыяў і асяньненьня мутных плянаў яе закладчыкаў-„узгадаваўцаў", паўстала яна дзеля таго, каб гэныя „ўзгадаваўцы" мелі для сябе свабоду ў іх лёкайскай і сэрвілістычнай працы (якой доказы ўжо далі „працуючы" у рамах Б. С. С.), паўстала яна дзеля таго, каб стацца экспозытурай(!) некага, — урэшце дзеля таго, каб корпоранты маглі часьцей зрабіць „налей, налей — бокал полней"!!!...

Гэтае другое студэнскае выступленьне, прыняўшы вышэйсказаную арганізацыйную форму, ёсьць вельмі сумнай праявай беларускага студэнскага жыцьця на Віленскім грунце, і як такая, пэўне-ж, — веру моцна — выкліча адпаведную рэакцыю з боку здаровых этычна і ідэёва беларускіх студэнтаў, перадусім уваходзячых у склад Беларускага Студэнскага Саюзу, на чале з яго урадам.

Ня можна дапусьціць, каб студэнская моладзь, якая ўжо ўвайшла ў рады корпорантаў, наслухаўшыся пэўне-ж, „салодкіх і дасьціпных" слоў арганізатараў, а такжа моладзь, якая мо' яшчэ ўвойдзе ў тыя-ж рады, — губляла ў корпорацыі чысьціню беларускай душы, як этычную, так і народна-беларускую!

Я—уль.

З газэт.

Прэзыдэнт Сметона аб эканамічным і палітычным палажэньні Літвы.

Віл. польская газэта „Słowo" падае зьмест гутаркі, якую вёў прэзыдэнт Літвы Сметона з адным рыскім журналістам аб агульным палажэньні Літоўскай рэспублікі. Словы прэзыдэнта Сметоны мелі поўны ўрадавы характар і затым „Słowo" аб гэтым піша даволі шырока.

Што-ж казаў прэзыдэнт Сметона?

Перадусім падкрэсьліў вялікую вагу літоўскага сялянства, пры гэтым адзначыў, што сяляне лепш маюцца, як сярэдняя і большая ўласнасьць, а гэта відаць хоцьбы з таго, што сяляне могуць выкладаць вялікія кошты на адукацыю сваіх дзяцей, каторых пасылаюць у горад. Потым прэзыдэнт падкрэсьліў сталасьць літоўскай валюты (літа), пакрыцьцё якога даходзіць да 78 прац. Літоўскія фінансы так добра стаяць, што асталіся яшчэ ня выкарыстаны 20 мільён. літаў, якія былі ўнесены ў літоўскі банк з сум швэдзкага сернікавага манаполю. Гэтыя грошы астаўлены да вясны, як рэзэрва. Літва вельмі заінтэрэсавана апошнімі выбарамі ў Англіі і магчымымі мытнымі агранічэньнямі, якія проектуе новы ангельскі урад, абапёрты на консэрватыстах, бо Літва паддзержывае жывыя гандлёвыя зносіны з Англіяй. Потым прэз. Сметона гаварыў аб вялікім значэньні для Літвы прысуду Гаскага Трыбуналу, паводле якога Літва не павінна адчыняць чыгунак для зносін з Польшчай. Прэз. Сметона называе гэты прысуд вялікай маральнай перамогай Літвы. У цяперашнім нутраным палажэньні Літвы ёсьць, паводле прэз. Сметоны, толькі адно балючае месца— гэта адносіны з духавенствам. Што датыча народнага прадстаўніцтва, то літоўскі ўрад ужо ўзышоў на дарогу рэалізаваньня выбарных форм у кіраваньні Літвою. Але правам выбараў павінны карыстацца перадусім гаспадары, якія вядуць гаспадарку, але ня іх дзеці, хоць-бы яны былі дарослыя, калі яны не вядуць на сябе гаспадаркі. Таксама выбарныя правы павінны мець урадаўцы, плацельнікі падаткаў і ўсе тыя, якія маюць нейкую сувязь з дзяржавай. Гэтакую форму выбараў літоўскі ўрад будзе праводзіць і пры выбарах прэзыдэнта.

У склад самаўраду ў Літве ўваходзяць усе народнасьці. Пры помачы самаўрадавых органаў урад думае ўзгадоўваць народ і і культурна і палітычна. Ва ўсіх праектах Літва стараецца выкарыстаць іншыя пробы і досьледы, але ніколі не забываецца, што Літва — гэта край адменны і затым літоўскі ўрад ня сьпяшыць з ніякімі важнейшымі рэформамі, маючы на воку тыя асновы, на каторых будуецца літоўская дзяржаўнасьць.

З гэтай гутаркі прэз. Сметоны відаць, скольки ён мае рупнасьці і разам з гэтым асьцярожнасьці ў кіраваньні дзяржавай.

„Моцныя словы".

Пад такім загалоўкам „Przegląd Wileński" (№ 20 з дн. 8.XI.31), абгаварваючы водгукі польска-латыскага канфлікту, зварочвае ўвагу на апінію ў гэтай справд і з боку латыскага.

У гэтай стацьці „Przegl. Wil." чытаем перадрук з латыскай газэты „Socjaldemokrats", які канчае „Przegląd Wileński" такім сказам:

...„Цяпер польскія нацыяналісты і шовіністы падымаюць нябывалы алярм у газэтах і ў Сойме (інтэрпэляцыі) ў справе „прасьледаў братоў — Палякоў у Латвіі".

„Сапраўды, польскі шовінізм ня мае граніц. Польскія нацыяналісты, якія ў сваей дзяржаве найбрутальнейшым спосабам уціскаюць Украінцаў і Беларусаў пачынаюць вучыць Латвію палітыкі адносна народных меншасьцяў.

З жыцьця Беларускага Народу ў Польшчы.

Украінская часопісь „Новий Час" (нумары 76-94) зьмясьціла нядаўна цэлы рад артыкулаў, у якіх падавала для ўкраінскага грамадзянства шмат інфармацыйнага матэр'ялу з беларускага жыцьця. Уважаем, што гэтыя інфармацыйныя даныя будуць цікавыя і для беларускага грамадзянства і затым перадрукоўваем усе тыя артыкулы „Новага Часу" з некаторымі дапаўненьнямі.

РЭДАКЦЫЯ.

1. Патрэба ўзаемнага пазнаньня паміж украінцамі і беларусамі і патрэба бесстаронных інфармацыяў.

„Діло" ў некулькіх нумарох (гл. 121, 123, 125. 127, 132 г. г.) абгаварывала жыцьцё і палажэньне беларускага народу ў Польшчы, з тэй мэтай, каб даць украінскаму грамадзянству поўны і бесстаронны абраз гэтага жыцьця, бо паводле „Діла", дагэтуль усе весткі аб беларусах быццам былі аднастаронны і дзеля гэтага скупы і няпоўны.

Мэта бязумоўна добрая, бо нішто, здаецца, так ня дзеліць людзей і народаў, як узаемная незнаёмасьць аб жыцьці і палажэньні. Пры гэтым мусім адзначыць, што ўкраінская прэса наагул, а асабліва „Діло", дагэтуль вельмі мала інтэрэсавалася жыцьцём беларускага народу і яго палажэньнем у Польшчы, ужо не гаворачы аб тэй частцы, якая апынулася за межамі Польшчы. Тады калі частка беларускай прэсы ўвяла нават спэцыяльныя аддзелы з мэтай асьвятленьня ўкраінскіх спраў (нпр. „Б. Крыніца", „Шлях Моладзі"), то ўкраінская прэса, якую вельмі інтэрэсуюць падзеі заграінчнага жыцьця, якая з заграніцы падае найменшую дробязь, то ў гэтай прэсе (за вынняткам можа „Неділі") аб беларускіх справах дагэтуль было ціха. Толькі часам, дзе-ня-дзе, зьявіцца якая кароценькая вестка аб жыцьці беларускага народу, але і тая вестка часам сьведчыла аб тым, як мала аўтар яе ведае аб сваім паўночным суседзе! А тымчасам справа суседзкага пазнаньня вельмі важная: калі мы імкнёмся пазнаць далейшыя народы, то ў першую чаргу трэба пазнаць бліжэйшыя, суседнія, асабліва тыя, з якімі злучыла нас мінуўшчына, лучыць цяпершчына, а можа, дасьць Бог, будзе лучыць і будучыня.

„Діло", відаць, адчула гэтую пустату ў беларуска-украінскім узаемным пазнаньні і пашло яму, гэтаму пазнаньню, на спатканьне, але мусім сказаць праўду, якжа-ж няўдала, як аднастаронна і няпраўдзіва. Пісала тыя стацьці нібы асоба, якая жыве заўсёды між беларусамі і якая нібы дасканальна ар'ентуецца ў беларускіх справах. Тымчасам мы, беларусы, жывучы тут, пасярод сваіх суродзічаў і працуючы на беларускай ніве, бачым у гэтых стацьцях шмат недахватаў, перакручваньняў фактаў, нацяжак і нават і няпраўду*). Затым уважаем за наш сьвяты абавязак, у імя праўды, узяць за пяро і напісаць ня столькі адказ на тыя стацьці, сколькі даць украінскаму грамадзянству магчыма бесстароннае і праўдзівае асьвятленьне беларускага жыцьця ў Польшчы. Дзеля гэтага будзем пісаць ня з тэй мэтай, каб накідаць нашыя пагляды ўкраінскаму грамадзянству, як якіясь догматы, але болей з тэй мэтай, каб прабудзіць у гэтым грамадзянстве большы інтэрас і зацікаўленьне беларускімі справамі, каб паддаць яму ахвоты да бесстаронных досьледаў над жыцьцём і палажэньнем суседняга беларускага народу і каб гэткім парадкам прычыніцца да большага і лепшага ўзаемнага пазнаньня, абапёртага на об'ектывізьме.

У імя гэтага пачынаем нашы стацьці.

Але пісаць іх будзем ня так, як наш папярэднік у „Діле", без хронолёгічнага парадку і належнага прагматызму, не падаючы ніякіх дакумэнтаў і фактаў, а толькі галаслоўна выказваючы свае асабістыя, чыста суб'ектыўныя пагляды, але возьмем гэтыя нашы стацьці ў рамкі сьціслай хронолёгіі: падаючы папарадку факты, будзем падаваць і прычыны фактаў, разам з гэтым будзем падаваць і дакумэнты, асьветляючыя важнейшыя падзеі. Думаем, што гэтакім парадкам мы найлепш споўнім сваё заданьне, бо: пададзём фактычны стан беларускага жыцьця ў Польшчы, пакажам жаралы, адкуль мы чарпалі нашыя інфармацыі і разам з гэтым, спадзяёмся, прабудзім у ўкраінскім грамадзянстве ахвоту да самастойных досьледаў над жыцьцём беларускага народу.

*) Як даведываемся, тыя стацьці вышлі з пад пяра вядомага на віленскім грунце „патрыярха" беларускай полёнофіліі.

З Беларускага Жыцьця

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Новы пагром беларусаў. У апошнія часы камуністычныя ўлады на тэрыторыі Усход. Беларусі арыштавалі за народны дэмократызм больш 200 асоб, якіх аддалі пад суд. У сувязі з гэтымі арыштамі выключаны з камуністычнай партыі на Беларусі: Балуновіч, Баліцкі, Кронмэль і інш., якім камуністы закідаюць лучнасьць з беларускім народным дэмократызмам.

В. грамадаўскія паслы: Рак-Міхайлоўскі, Мятла, а з імі і Бурсэвіч, як падаюць газэты, назначаны на высокія камуністычныя становішчы ў Радавай Беларусі.

Савет камуністычнай Акадэміі Навук на Беларусі складаюць ў сёл. годзе: — прэзыдэнт Горын, Шчэрбакоў і Якуб Колас, як віце-прэзыдэнты.

Выдавецтва. У сёл. годзе ў Рад. Беларусі выдана 2777 кніжак.

„Хлебазагатоўкі." Як падаюць менскія газэты, дагэтуль скалектывізавана ва ўсей Рад. Беларусі 51 проц. гаспадарак. Цяпер ідзе па вёсцы хлебазагатоўка г. зн. перайманьне ад гаспадароў і калгасаў збожжа на патрэбы гораду, войска і г. д. З гаспадарамі справа ідзе лягчэй: яны баючыся кары, аддаюць апошняе, але зусім ня тое з калгасамі: там сяляне, пачуўшыся ў дружыне, сьмялей выступаюць процiў партыйных і дзяржаўных загадаў і аддаюць толькі тое, што астаецца пасьля адлічэньня на пракорм людзей, скаціны, на сяўбу і агулам на патрэбы калгасу. Процiў такой тэндэнцыі калгасаў камуністычныя ўлады выступаюць з цэлай рашучасьцю, дамагаючыся насамперш здачы збожжа для дзяржавы паводле распрацаванага пляну. Дагэтуль (да 1.XI.) здана жыта толькі 21 проц., ячменю і аўса 29 проц., бульбы 30 проц., а лёну толькі 1 проц. Месяц ад 10 лістапада да 10 сьнежня абвешчаны цэнтральнымі ўладамі Б.С.Р.Р. як месяц загатоўкі лёну, загадваючы срога, каб „ні ў якім разе не дапускаць паўтарэньня леташняй памылкі, якая выявілася ў недапушчальнай зацяжцы здачы лёну—пянькі, што сарвала загатоўчыя пляны" (Зьвязда 1.XI.31). З лёном так дрэнна, што фабрыка „Дзьвіна" скаржыцца, што „нам трэба 15 тон (900 пудоў) у дзень, а атрымалі ад 15 да 18.X. толькі 10 тон лёну новага ўраджаю г. зн. толькі дзьве трэціх для дзеннай работы фабрыкі" (Сав. Беларусь 1.XI-31).

Дзеля вялікіх труднасьцяў з хлебазагатоўкай наагул, саветы прыпынілі экспорт заграніцу збожжа, што адразу адчулася ў Англіі, дзе збожжа падаражэла на 5 шылінгаў на бушэлю (бушэль—27 кілягр.).

Школьныя недахопы. Камуністы стараюцца выправіць цяпер недахопы ў школьніцтве. Галоўны недахоп заключаецца ў тым, „што навучаньне ў школе не дае дастатковага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў і нездавальняюча вырашае задачу падрыхтоўкі да тэхнікумаў і вышэйшых школ сусім пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навук." (Сав. Б. 1.XI). Другім недахопам уважаюць там лішнюю „славеснасьць" у навучаньні з паміnаньнем фізычнай працы, якую там завуць палітэхнізацыяй. Як гэту „політэхнізацыю" разумеюць на мясцох, сьведчыць факт з Бярэзінскага раёну, дзе „паводле распараджэньня раённага інспэктара, школы былі мабілізаваны на ліквідацыю прарываў у дарожным будаўніцтве, а некаторыя загадчыкі школ на раённай канфэрэнцыі спрабавалі давесьці, што гэта і ёсьць палітэхнізацыя."

У кастрычніку месяцы па Б.С.С.Р. не хапала звыш 500 настаўнікаў масавай пачатковай школы. Саюзны С.Н.К. (Савет Народн. Камісараў) гэтымі днямі выдаў дэкрэт аб падвышэньні пэнсыі настаўнікам пачатковых школ да 90 рублёў у месяц і школ 2-ой ступені—да 130 руб. (90 руб. гэта 9 чырвонцаў, а чырвонец у Вільні каштуе 3 зл. 50гр. значыць вучыцель пачатк. школы ў саветах бярэ каля 30 зл. у месяц!) Каб зразумець гэтае дзіўнае зьявішча, трэба ведаць, што саветы ў сябе дома дзяржаўнымі дэкрэтамі стараюцца паддзяржаць курс чырвонца значна вышэй і выдаюць па картачках усё па таннай цане, але гэта ня мяняе факту, што пералічыўшы на заграмічную валюту вучыцель у саветах бярэ вельмі мала.

Парадкі ў калгасах. З Дуброўны паведамляюць, што ў калгасе „Прамень Кастрычніка" да зімоўкі яшчэ не рыхтуецца. Хлявы не прыстасаваны, станкоў няма, няма нават кармушак. Сярод калгасьнікаў наглядаецца недысцыплінаванасьць, нявыхад на працу.

У Клімавічах ня гледзячы на тое, што набліжаецца зіма, у калгасе „Ленінскі Шлях" 103 дойныя каровы стаяць пад адкрытым небам. Праўленьне ня турбуецца прыстасаваць хацяб існуючыя хлявы пад аборы. Старшыня калгасу не аддае ўвагі пытаньням падрыхтоўкі да зімы. Ужо два тыдні, як няведама куды дзеўся. Калгас астаўся амаль бяз кіраўніцтва. Райкалгассаюз (Раённы саюз калгасаў) ніякай дапамогі не аказвае (Зьвязда 2.XI.31).

Таксама нядобра з гаспадарчымі машынамі. І так — „буйнейшым у Беларусі мэханізаваным каноплеводчым саўгасе імя „10-годзьдзя Б.С.С.Р." амаль усе машыны і днём і ноччу знаходзяцца на двары пад дажджом трактарныя сеялкі, плугі і інш. На ільнянаводчым саўгасе „Барковічы" ў свой час ня ўбралі нават ільнацерабілак. Забруджаныя машыны асталіся ў полі. Зараз на іх... парос лёя" (Зьвязда 3.XI.31).

ІІІ-ці ўсебеларускі зьезд навуковых працаўнікоў. адбыўся ў Менску ў канцы кастрычніка. Працы і рэзалюцыі прынятыя на зьездзе, былі скіраваны на падмогу „соцыялістычнаму будаўніцтву." „Зьвязда" (3 XI.) хоча, каб сэкцыя навуковых працаўнікоў (якіх яна налічвае да 1200) ператварылася ў сапраўдную школу комунізму.

Пастановы пленуму Ц. К. Усесаюзкай Кам. Партыі. З 28-га 31.X г. г. у Менску адбыўся сход пленуму Ц. К. Усе— К. П. (б.) На гэтым сходзе былі абгавораны справы чыгуначнага транспарту і справы савецкага гандлю. Прынятыя на сходзе пастановы сьведчаць аб руіне цяперашняга савецкага транспарту. Пленум Ц. К. з усёй сілай падкрэсьліў, што „будзе лічыць мясцовыя парт. арганізацыі адказнымі за прарыў у рабоце транспарту на тым ці іншым вучастку."

У справе гандлю, які маюць праводзіць саўгасы і каўгасы, то пленум падкрэсьлівае, што гандаль калгасаў і саўгасаў „павінен разгортвацца толькі пры неабходнай умове акуратнага выкананьня здачы прадукцыі дзяржаве." (Сав. Б. 3.XI) Значыць спачатку здаць прадукцыю (збожжа і жывёлу) дзяржаве, а потым гандляваць. Але пытаньне, што тады астаецца для гандлю?

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Паводле сёлетняй перапісі ў Латвіі налічваецца беларусаў 36 029, з якіх 22.220 каталікоў, 9.280 праваслаўных, а рэшта іншых веравызнаньняў. Трэба адзначыць, што статыстыка гэта нязгодная з праўдай, бо сапраўды беларусаў у Латвіі ёсьць куды больш.

Польскім шовіністам, якія цяпер вядуць атаку на Латвію можна спакойна адказаць: „Прэч з рукамі ад нутраных спраў Латвіі. Завядзіце слушную мэтоду адносін да народных меншасьцяў у Польшчы. Тады будзеце мець прынамсі маральнае права гаварыць аб палажэньні народных меншасьцях у іншых дзяржавах".

З Украінскага жыцьця.

Звальненьне з вастрогу б. пасла Палііва. Дня 7.XI. г. г. выйшаў на волю апошні берасьцейскі вязень б. пасол Дмітро Паліiў за каўцыю 16 тысяч зл. Дмітро Паліiў прасядзеў 14 месяцаў.

З Польшчы.

Закрыцьцё сэсіі Сойму і Сэнату. Прэзыдэнт Польскай Рэспублікі дня 10 г. м. закрыў сэсію Сойму і Сэнату на 30 дзён. Паседжаньні Сойму і Сэнату пасьля гэтай „перадышкі" пачнуцца 10 сьнежня с. г.

II. Пэрыяд суцэльнага беларускага нацыянальнага фронту (1919 — 1925).

Пасьля няўдачных спробаў стварэньня самастойнай Беларускай Народнай Рэспублі-і пасьля Рыскага (1921) дагавору, паводле якога Заход. Беларусь адышла пад уладу Польшчы, беларускія дзеячы, якія апынуліся пад Польшчай, забыліся пра ўсе даўнейшыя спрэчкі і партыйныя падзелы, але дзяржаліся адзінага нацыянальнага фронту. Астаткі беларускіх сацыял-дэмакратаў, эсэраў, хадэкаў, сац.-фэдэралістаў, якія даўней былі згуртаваўшыся каля Рады Бел. Народнай Рэспублікі, перацярпеўшы шмат зьдзеку і палітычнага ашуканства ад розных варожых сілаў, якія хадзілі з усходу на захад і наадварот па Беларусі, жылі цяпер у добрых партыйных адносінах, паддзержываючы адны адных ва ўсялякіх народных выступленьнях. Вынікам гэтага згоднага міжпартыйнага сужыцьця было ўтварэньне ў 1919 годзе Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, куды ўваходзілі прадстаўнікі ўсіх, існуючых тады ў Зах. Беларусі партыяў, з выняткам толькі полёнофілаў. Паміж тагачаснымі полёнофіламі галоўнае месца займаў Павал Аляксюк, б. старшыня Бел. Вайсковай Камісіі, створанай Пілсудскім нібы для тварэньня беларускага войска.

Вось-жа гэты Бел. Нац. Камітэт і ўвайшоў ад імя ўсяго беларускага народу ў выбарчы блёк нацыянальных меншасьцяў у 1922 г. і праводзіў выбары, з якіх вышла 11 беларускіх пасло́ў і 3 сэнатараў.

Згода ў Бел. Нац. Камітэце паддзержывалася яшчэ і тым, што ўсе сябры яго не ар'етаваліся ані на Польшч, ані на Саветы, як на дзяржавы найболей варожыя для самастойнасьці і незалежнасьці Беларусі. Аднак на пачатку 1924 г. бачым ужо пасярод некатарых беларускіх пасло́ў спробу шуканьня новых дарог — гэтай „новай" дарогай мела быць адноўленая ар'ентацыя на Польшч або так зв. полёнофільства. Але гэтыя спробы ня былі пахвалены большасьцю Бел. Пасольскага Клюбу і нават прывялі да крызысу ўнутры гэтага Клюбу.

Спробы полёнофільства былі зроблены праз утварэньне ў Вільні Польска-Беларускага Т-ва, закладчыкамі якога былі: сэнатары Бр. Крыжаноўскі і Уласаў, паслы Вэндзягольскі і Тарашкевіч, адвакат Вітальд Абрамовіч і дырэктар Віленскай Бел. Гімназіі Р. Астроўскі. Т-ва гэнае мела на мэце: „узаемнае зближэньне і супрацоўніцтва польскага і беларускага грамадзянстваў на ніве навукі, культуры, гісторыі, літэратуры, мастацтва, звычаяў і г. д.".

Стварэньне гэтага Т-ва пры ўчасьці прадстаўнікоў ад беларускага грамадзянства: сэнатара Уласава, пасла Тарашкевіча і дыр. Астроўскага было першай спробай дэзор'ентацыі бел. грамадзянства і прывяло, як мы ўжо казалі, да крызысу ў самым Бел Пасольскім Клюбе. Старшыня гэтага Клюбу Браніслаў Тарашкевіч быў прымушаны ўступіць з свайго становішча, а на месца яго быў выбраны пасол Рагуля, яркі незалежнік. Гэтакім парадкам большасьць клюбу зганіла ўсе спробы Тарашкевіча ў кірунку полёнофільства.

Але зараз пасьля гэтага ў душы Тарашкевіча пад уплывам нейкіх таёмных дзейнікаў пачынаецца пералом. Якраз у тым часе ў Усход. Беларусі, якая апынулася пад Саветамі, адбываліся важныя падзеі. Камуністы да 6 паветаў Меншчыны, з якіх тагды складалася Савецкая Беларусь, далучаюць 16 паветаў Магілёўшчыны і Віцебшчыны і абяцаюць далучыць яшчэ Гомельшчыну, даюць пры гэтым беларускаму народу поўную магчымасьць разьвіцьця свaей культуры і нават дзяржавы, закладаюць цэлы рад вышэйшых і сярэдніх, а так-жа тысячы ніжэйшых беларускіх школаў і г. д., а ў Польшчы пад той час праводзіцца асадніцтва і колёнізацыя беларускіх зямель і прыгатаўляюцца так зв. „языковыя ўставы". Тарашкевіч пачынае хіліцца на ўсход. Яшчэ 19.III.24, прамаўляючы ў Сойме ў справе Клайпэды і Нёману, Тарашкевіч кажа: „Толькі наданьне шырокай аўтаноміі дасьць разьвязаньне пытаньня аб Нёмане, Клайпэдзе і нават Вільні. Наданьне аўтаноміі для беларускіх земляў, а так-жа спыненьне аканчальна, выразна і шчыра ўсіх плянаў колёнізацыі і полёнізацыі — толькі ад гэтага пункту можа пачацца зварот у адносінах, так патрэбны і так пажаданы для усіх людзей добрае волі. І толькі гэты зварот можа давесьці да згоды паміж палякамі,

081530

З заграніцы.

Пасьля выбараў у Англіі утварыўся новы ўрад, у які ўвайшло 11 консэрватыстаў, 5 народна-рабочай партыі і 4 народна-лібэральнай. На чале ўраду астаўся Макдональд. Міністрам замежных спраў вызначаны Джон Саймон з народна-лібэральнай групы. Назначэньне міністара з гэтай групы мае вялікую вагу для палітычнага жыцьця ўсей Эўропы, бо Джон Саймон будзе весьці лінію якую вёў Гэндэрсон, а потым Рыдінг. Калі англ. консэрватысты імкнуцца да таго, каб увайсьці ў цесную сувязь з Францыяй і разам з ёй бараніць дяперашняга парадку ў Эўропе (г. зн. Вэрсальскага трактату пад паводырствам Францыі), то лінія Гэндэрсона і Саймона болей зварочвае ўвагу на агульна-эўрапэйскае аб'еднаньне, на згоду францыі і Нямеччыны і на Лігу Народаў. Выбары ў Англіі—гэта стабілізацыя дасюлешняй ангельскай палітыкі і стабілізапыя... цяперашняга парадку ў Эўропе. Чакаць на нейкія зьмены ў Эўропе ня прыходзіцца.

Крызыс у Латвіі. У Латвіі штораз мацней дае сябе пачуць эканамічны крызыс. Паводле апошніх даных Латвійскага Статыстычнага Праўленьня (за кастрычнік) адчуваецца ў краі вялікае бязграшоўе. Каб не дапусьціць да спадку лата, Банк Латвіі, маючы ў дастатковым ліку золата і чужой валюты для пакрыцьця папяровых грошай, пачаў лік гэтых грошай зьменшаць. І так, у канцы жніўня хадзіла па людзях 108 мільёнаў, а ў канцы кастрычніка яшчэ менш. Затым у краі адчуваецца вялікі недахват грошай. Другім зьявішчам крызысу ёсьць выйманьня грошай з банку (крызыс недаверу!). У студні г. году было ў банках 190 мільён. Трэцім пунктам крызысу ёсьць вялікі лік апратэставаных вэксалёў. А далей ідзе ўпадак гандлю з заграніцай, беспрацоўе на фабрыках, павялічэньне безработных і г. д. Галоўным заданьнем новага латвійскага ўраду ёсьць зысканьне для сябе даверу ў насельніцтве, а з даверам насельніцтва вернуцца ўклады і ў банкі, а з паваротам укладу ў банкі будзе разьвівацца і эканамічнае жыцьцё.

Выступленьне з „Цэнтрасаюзу“ Бацькаўскага Камітэту Клецкае Беларускае Гімназіі.

Як відаць з паданага ніжэй артыкулу пад загалоўкам „Да справы Клецкае гімназіі“, Бацькаўскі Камітэт гэтае гімназіі адклікаў сваіх прадстаўнікоў з полёнофільска-санацыйнага так зв. „Цэнтрасаюзу“. Цікава, хто там яшчэ астаўся.

Да справы Клецкай гімназіі.

25 кастрычніка г. г. адбыўся надзвычайны агульны сход Бацькаўскага Камітэту Клецкай беларускай гімназіі. Па заслуханьні дакладу Управы Камітэту аб тых захадах, якія былі зроблены ёй ў справе атрыманьня канцэсіі на гімназію на 1931-32 шк. год і аб тым, што Міністэрства Асьветы, ня гледзючы на беспадстаўнасьць адных і малую вартасьць другіх закідаў Камітэту, на якіх Куратарыюм апірае сваю адмову прадоўжаньня канцэсіі на гімназію, усётакі не прыхілілася да апэляцыйнае просьбы Камітэту і тым пацьвердзіла адмову Куратарыюму. — Сход не захацеў згадзіцца з фактам зачыненьня гімназіі і пастанавіў весьці далейшыя стараньні перад Цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі аб тым, каб Клецкая беларуская гімназія была ўзноўлена хацяб і ў сярэдзіне школьнага году; даручыў Управе зараз-жа падаць Міністру Асьветы аб тым просьбу; для патрыманьня просьбаў Камітэт упаважніў Управу высылаць адумысныя дэлегацыі; на выдаткі, зьвязаныя з гэтымі новымі захадамі, бацькі абклалі сябе новай аднаразовай складкаю пяць зл.

Застанавіўшыся над тым, якое становішча заняў да гімназіі і да справы прымусовай ліквідацыі яе ўладамі „Цэнтральны Саюз Беларускіх культурна-прасьветных і гаспадарчых арганізацыяў і ўстановаў,“ у склад якога ўваходзіць і Бацькоўскі Камітэт Клецкай Беларускай Гімназіі, Сход прыняў наступную рэзалюцыю: не ўваходзячы ў ацэнку агульнай дзейнасьці Цэнтрасаюзу і ня прымаючы на сябе адказнасьці за яе, дзеля таго, што Камітэт ні беспасрэдна ні цераз сваіх прадстаўнікоў у прэзыдыюм яго ня прымаў у гэтай дзейнасьці ніякага ўдзелу і ўплыву на яе ня меў, Сход канстатуе аднак няшчырасьць Цэнтрасаюзу ў адносінах яго да Клецкай Беларускай Гімназіі: ад пачатку свайго заснаваньня Ц. С., ў асобах яго кіраўнікоў, не глядзеў на Клецкую гімназію як на самавартасны аб'ект у здабытках беларускага адраджэнскага руху, які, як адзін з нялічных асяродкаў роднай культуры, трэба было-б усімі мерамі захаваць і для забясьпечаньня будучыні якога трэба было напружыць усе высілкі арганізаванаму беларускаму грамадзянству; Клецкая гімназія для Ц. С. была толькі аб'ектам пасрэднай вартасьці, які можна часам і зусім уступіць; калі школьныя ўлады загадалі ліквідацыю гімназіі, Ц. С. адразу прыняў гэтую ліквідацыю як факт дакананы, пагадзіўся з ім і адмовіўся як далучыцца да пратэсту ў гэтай справе другіх беларускіх арганізацыяў, гэтак і даць сваіх прадстаўнікоў у тыя дэлегацыі, якія выступалі, ці мелі выступіць, перад уладамі ў абароне Клецкай гімназіі.

Сьцьвярджаючы вышэй пададзенае, Сход знаходзіць бязмэтным і нават шкодным для справы далейшы ўдзел Бацькаўскага Камітэту Клецкай Беларускай Гімназіі ў „Цэнтрасаюзе,“ які адмаўляе яму, сябру Саюзу, нават у маральным падтрыманьні яго ў змаганьні за права існаваньня, і пастанаўляе: Бацькаўскаму Камітэту Клецкай Беларускай Гімназіі безадкладна выступіць са складу Цэнтрасаюзу і ўдазваць з прэзыдыюму яго сваіх прадстаўнікоў.

Сэкрэтар Сходу А. Сідаровіч.

Да беларускага грамадзянства.

Падаючы да ведама, што Бацькаўскі Камітэт Клецкай Беларускай Гімназіі, ня гледзячы на адмову Куратарыюмам і Міністэрствам Асьветы прадоўжаньня канцэсіі на Клецкую гімназію, пастанавіў усётакі дамагацца, каб гімназія была ўзноўлена і прымаючы пад увагу тое, што стараньні Камітэту зьвязваюцца з значнымі выдаткамі як на выправы ў адміністрацыйныя цэнтры дэлегацыяў, гэтак і на аплату школьных будынкаў да часу аканчальнага вырашэньня справы, а гэтак і тое, што Клецкая гімназія, як адна з нялічных нашых сярэдніх школаў у межах Польшчы, апрача мясцовага значэньня, мае значэньне і агульна беларускае, Управа Камітэту зварочваецца да ўсяго нацыянальна сьвядомага беларускага грамадзянства з заклікам прысьці Камітэту з пасільнай дапамогай. За ўсякую ахвяру Управа Камітэту скажа ахвярадаўцу шчырае беларускае „дзякуй.“

м. Клецк 5.XI-1931 г. **Управа Камітэту.**

Пісьмо ў Рэдакцыю.

У апошнія часы мы, ніжэйпадпісаныя, паасобна пераслалі ў Прэзыдыюм Корпарацыі „Scorinia“ лісты з просьбай аб скрэсьленьні нас з ліку яе сяброў, а гэта дзеля прычын характару ідэолёгічнага і прынцыповага. Дзеля гэткіх-жа самых матываў выступілі яшчэ і іншыя. Зьявішча гэтае тлумачыцца тым, што пры закладаньні Корпарацыі шляхі яе былі зусім іншымі, чым гэта цяпер разумеюць яе сябры і нават стараюцца іх ажыцьцёвіць. Нашае выступленьне з Корпарацыі зьяўляецца таму зусім зразумелым. Для беларускага студэнта павінна быць сорамам і ганьбай тое, што будзе рабіцца на некарысьць Беларускага Народу рукамі гэтага студэнта.

9.XI.31 г. **С. Сарока, Я. Бурак,**

Ад рэдакцыі: Даведваемся, што з корпарацыі „Scorinia“ выступілі так-жа студ. Ільяшэвіч і Жураўлёў.

беларусамі і літоўцамі: інакш ня можа быць згоды, **а кажу тут з поўнай шчырасьцю, жадаючы гэтай згоды**".

З гэтай прамовы відаць, што яшчэ 19.III.24 г. Тарашкевіч быў полёнофілам. Але вось, месяц потым, у першай палавіне красавіка, Тарашкевіч ужо выступае з вельмі вострай прамовай проціў палітыкі польскага ўраду, чым выклікае агульнае абурэньне польскіх паслоў, а яшчэ пару месяцаў потым (13.VI.24) Тарашкевіч у тым-жа Сойме ўжо гразіць, што ўсё польскае асадніцтва і колёнізацыя пойдзе „z dymem pożarów, z kurzem krwi bratniej“ і гэтак гаворыць: „Народ наш беларускі ня верыць ужо сяньня ў магчымасьць тэрытарыяльнай аўтаноміі, бо ведае, што калі-б нават якіколечы сойм пад прымусам якіхколечы „прычын“ гэтую справу правёў і даў аўтаномію, то няма пэўнасьці, што гэта аўтаномія, таксама як і канстытуцыя, ня будзе пагвалчана і зламана. Беларускі народ сьцьвярджае толькі факты і сяньня яшчэ тымболей зварачвае свае вочы на ўсход, дзе бачыць магчымасьць разьвіцьця і дзе многа робіцца, каб цяжкое сяньняшняе палажэньне селяніна было палепшана. ...Досьлед і зімная развага прымушаець да вываду, што разьвязаньне тых палючых задач прыходзіцца чакаць найхутчэй ад глыбокіх устрасеньняў, ад палітычнай і сацыяльнай рэвалюцыі".

Апошнія словы зусім ясны: Тарашкевіч з полёнофіла стаўся советофілам і прыняўся нават камуністычнай тэорыяй у справе сацыяльнай рэвалюцыі. Ад гэтага часу пачынаецца новая, болей глыбокая, дыфэрэнцыяцыя ў вутры Б. Пас. Клюбу. Дасюлешнія полёнофілы радыкальна павярнулі з захаду на ўсход, пацягаючы за сабою вялікую частку Б. Пас. Клюбу.

У гэтым часе выступіў з Польска-Беларускага Т-ва і дыр. Астроўскі, які ў адкрытым пісьме на імя В. Абрамовіча (дн. 29.V.24.), з даручэньня сваіх калегаў і знаёмых, піша, што ня бачыць магчымасьці далей супрацоўнічаць у гэтым Т-ве. „Трываючая дагэтуль палітычная вайна не дае магчымасьці прыняць удзелу у Т-ве нават тым з беларусаў, каторыя яшчэ так нядаўна выказалі сваё шчырае жаданьне знайсьці нейкі спосаб дзеля аслабленьня і злагоджаньня таго жудаснага зьдзеку, які так плянова і няўпынна праводзіць польская ўлада адносна беларускага грамадзянства. Ад пачатку нашых захадаў да збліжэньня абудвых народаў беларусы ня бачаць зьмены ў адносінах да іх ня толькі польскае ўлады, але нават польскага грамадзянства.“

Такім парадкам наступіў ідеолёгічны, а лепш кажучы „ар'ентацыйны“ падзел у Б. Пас. Клюбе: вялікая частка паслоў, а за імі і вялікая часьць беларускага народу, захопленая будаўніцтвам Савецкае Беларусі, пайшла на ўсход...

Але беларускае грамадзянства і Б. Пас. Клюб яшчэ праз нейкі час былі навока адзінымі; паслы, якія зьмянілі сваю палітычную ар'ентацыю, аставаліся яшчэ ў адзіным пасольскім клюбе. Гэкак было праз цэлы год аж да пачатку ліпня 1925 году. У гэтым часе наступіў фармальны падзел адзінага дагэтуль Б. пас. Клюбу і стварылася Б. Сял.-Работвіцкая Грамада“, а разам з ею Т-ва Беларускай Школы. Ад гэтага часу пачынаецца так-жа фармальная дыфэрэнцыяцыя пасярод беларускага грамадзянства — і то ня толькі на полі палітыкі ці палітычнай ар'ентацыі, але і на полі сацыяльнай ідэолёгіі і на полі культуры. Марксызм пралазіць ўсюды і разьядае ўсё.

Падгатаўляючы да гэткага падзелу грунт орган „Грамады“ „Б. Доля“(№ 26.1925) гэтак пісала: „Жыцьцё — мацней за ўсе штучныя палітычныя камбінацыі. І тое самае жыцьцё, якое прымусіла ў свой час усе беларускія групы і кірункіісьці адзіным нацыянальным фронтам, цяпер вымагае перагляду гэтага становішча, трэбуе вырашэньня пытаньня аб магчымасьці ці немагчымасьці адзінага нацыянальнага фронту ў нашым парлямэнскім прадстаўніцтве.“

Відаць, адзіны нацыянальны фронт быў прызнаны ў кіруючых сфэрах „Грамады“ немагчымым і затым наступіў падзел. (д. б.)

---

18 г. м. Бацькаўскі Камітэт Віл. Бел. Гімназіі ладзіць

Канцэрт-Вечарыну

на карысьць незаможных вучняў гімназіі. Канцэрт-вечарына адбудзецца ў салі гімназіі (Вострабрамская 9). Пачатак а гадз. 8.

Выдавец А. Шутовіч.